ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ЧАЦВЕР
28
ЛІСТАПАДА
№ 29(1693)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

СУБ'ЕКТЫЎНЫЯ НАТАТКІ

## У чарзе за «Сцяпанам»

Наогул старастай я быць не хацеў. Часткова таму, што яму трэба мець справу з грашыма. Але мяне «ўламалі». І вось я ўпершыню іду за сцяпанам». У перакладзе са студэнцкага сленга гэта больш чым сціплая грашовая сума ў палову (!) афіцыйнага (!!) пражытачнага мінімуму (!!!), з дапамогай якой на студэнтах праводзяць пяцігадовы эксперымент на выжыванне ў экстрэмальных умовах.

15 кастрычніка. 14.26. У вестыбюлі галоўнага корпуса хвалюецца, бушуе, шуміць, абураецца, смяецца і расказвае анекдоты, нечым падсілкоўваецца і нешта чытае мора няўрымслівых старасты. Сціпла ўладкаваўшыся на беразе гэтага мора, я пешчу надзею пайсці адсюль не з пустымі рукамі. Хвілін праз 20 пад'язджае машына, і два дужых добраахвотнікі з чаргі, зусім будзённа, быццам займаліся гэтым усё жыццё, уносяць мяшок з грашыма. Яшчэ паўгадзіны пайшло на пералік гэтых грошай.

Нарэшце, акенца касы адчынілася. Народ акрыяў не толькі духам, але і сілушкай. Адны нахабна прабіваліся, другія далучыліся да сяброў, трэція, а такіх было большасць, паслухмяна чакалі сваёй чаргі, сярод іх — я.

...Стараста спяшаецца атрымаць стыпендыю раней. Гэта кожнаму зразумела. Незразумела іншае: чаму ў адзін і той жа дзень стыпендыю атрымліваюць журналісты і юрысты, філолагі і фізікі, разам узятыя? Няўжо яны непадзельныя, як сіямскія блізняты?

16.10. Каб нечым заняць сябе, спрабую чытаць Дастаеўскага. Зразумела, Фёдар Міхайлавіч не зусім падыходзячы аўтар. Хаця пачакайце... «Прыгнечаныя і зняважаныя». Ці гэта не зняважа — стаяць трэцюю гадзіну ў чарзе, а стыпендыі — на жаль, няма.

16.30. Чарга верна, але ве-е-ельмі марудна рухаецца. Ад касы адыходзяць радасныя ўладальнікі такіх пачкаў грошай, у суправаджэнні «групы падтрымкі» з ліку найбольш нецярплівых аднакурснікаў). За тое, што прапіхвалі свайго старасту бліжэй да акенца, яны атрымліваюць сваю долю тут жа, не адыходзячы ад касы.

16.50. У чарзе з'явіліся нездаровыя чуткі, быццам праз 10 хвілін каса закрываецца. А да жаданага акенца яшчэ чалавек дзесяць. Хочацца верыць, што гэтыя чуткі застануцца толькі чуткамі...

17.05. Жалезнае акенца касы — жаданая мэта мінулых амаль чатырох гадзін — зачынілася. Няма слоў, каб выказаць шкадаванне і ўсе пажаданні тым, хто судзіў нас на такое баўленне часу. Бачу па вачах, нешта падобнае адбываецца ў душах таварышаў па няшчасцю.

Р. S. А стыпендыю я ўсё ж атрымаў. На наступны дзень. Прастаяўшы тры гадзіны (не хлушу). Суму не называю, бо яна, як модна зараз гаварыць,— камерцыйная тайна.

А. ХМЯЛЬНІЦКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.



Студэнты другога курса факультэта радыёфізікі і электронікі Валерый ЯНУШКЕВІЧ і Андрэй ПРАСКУРЫН на лабараторных занятках.

Фота С. ГРЫЦА.

НУ І НУ!

## Якая музыка патрэбна таваразнаўцам і журналістам

Харавы і вакальна-выканаўчы цэнтр «Кантар» запрашаў на канцэрт мужчынскага камернага хора — адзінага прафесійнага калектыва ў Беларусі, які выконвае беларускую духоўную і свецкую музыку, творы чых беларускіх кампазітараў— Хор выбраў для свайго выступлення актавую залу інстытута народнай гаспадаркі па вуліцы Свярдлова. Менавіта ў гэтай зале хор праводзіў свае рэпетыцыі і запісваў кампакт-дыск. Бясплатны канцэрт гаспадарам вырашыў даць у якасці падзякі.

Незвычайная ў наш час тэматыка выступлення не зацікавіла ніводнага будучага спецыяліста народнай гаспадаркі і ніводнага студэнта факультэта журналістыкі, які размешчаны пад адным дахам з гандлёва-эканамічным факультэтам БДІНГа.

І ўсё ж такі хор выканаў некалькі твораў для асабістых гасцей, якія прыйшлі ў той вечар.

Вельмі здзівіўся намеснік дэкана аднаго з факультэтаў БДІНГа, што «творчыя людзі журфака не «клюнулі» на запрашэнне" (ад сваіх студэнтаў ён іншага, відаць, і не чакаў). Адзіны прадстаўнік ад гаспадароў падзякаваў хор за канцэрт і... папрасіў прабачэння. Артысты ў той вечар сумна жартавалі: «Відаць, вы без нас можаце, а мы без вас — ніяк».

А Ў ВАС? А Ў НАС!

## Канкурэнт у рэпетытара

Не кожны мае магчымасць вучыцца ў спецыялізаванай школе пры БДУ. Для тых, хто жыве за межамі сталіцы і жадае паступіць ва універсітэт або іншыя вядучыя ВНУ Беларусі, навукова-вучэбны цэнтр «Ліцэй» школы-ліцэя пры Белдзяржуніверсітэце арганізаваў завочныя падрыхтоўчыя курсы. У гэтым навучальным годзе завочны ліцэй дапаможа ў падрыхтоўцы да экзаменаў па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы. У будучым пералік прадметаў будзе прадоўжаны. Курсы працуюць на поўнай самастойнасці, плата за навучанне па адной спецыяльнасці — 180 рублёў у год.

Ні адныя падрыхтоўчыя курсы не гарантуюць паступленне ў ВНУ, але яны даюць веды. Завочны ліцэй не згубіўся сярод шматлікіх курсаў, якія прапануюць такія паслугі. Аб гэтым сведчыць салідная колькасць заяў ад жадаючых займацца.

КАБІНКА КАМЕНТАТАРА

## Нам не шанцуе

Нядаўна ў Брэсце адбыўся Першы адборачны тур фінала па баскетболу сярод вузаўскіх каманд Беларусі. У гульні прымалі ўдзел Брэсцкі педінстытут імя Пушкіна, Гомельскі універсітэта, Магілёўскі педінстытут, інстытут фізкультуры. Зборная нашага універсітэта, на жаль, не дамаглася перамогі.

— Асноўная прычына ў тым,— гаворыць старшы выкладчык кафедры фізвыхавання БДУ, трэнер мужчынскай каманды Аляксандр Васільевіч ДЫДЗІК, — што ў нашым універсітэце няма фізкультурнага факультэта, які ёсць у іншых навучальных установах.

Дарэчы, зараз у спорткомплексе БДУ праходзяць гульні па баскетболу на першынство універсітэта сярод факультэцкіх каманд (іх прадстаўлена 10).

У гэтыя ж дні праходзяць гульні і паміж камандамі студэнцкіх інтэрнатаў БДУ.

ВЫ ЧУЛІ?

## Новы год — у Будапешце

Нарэшце брат студэнт атрымаў амаль рэальную магчымасць пабываць за межамі краіны (маецца на ўвазе межы былога СССР).

Адзін з членаў ініцыятыўнай групы грэка-каталікоў узяў на сябе абавязкі па фарміраванню дэлегацыі беларускай моладзі і арганізацыі паездкі ў Будапешт, дзе з 30 снежня па 4 студзеня адбудуцца мерапрыемствы з гучнай назвай «Еўрапейскія сустрэчы хрысціянскай моладзі».

Андрэй — гэтак проста прадставіўся па тэлефоне незнаёмы дабрадзей — абяцае знаёмствы з венгерскімі сябрамі і моладдзю з іншых краін, цікавыя падарожжы па венгерскай сталіцы і... магчымыя бытавыя цяжкасці: у горшым выпадку, начоўкі ў спартыўнай зале адной са школ, у лепшым — размяшчэнне ў венгерскіх сем'ях.

Але, напэўна, такія нязручнасці ніколькі не палохаюць нашых студэнтаў. Сведчанне таму — тое, што толькі за адну гадзіну дзяжурства Андрэю патэлефанавалі 15 жадаючых увайсці ў склад дэлегацыі.

І галоўнае: для паездкі наяўнасць замежнага пашпарта неабавязковая, а кошт далёкага падарожжа складае 900 рублёў (нейкую частку можна заплаціць і валютай).

Кажуць, як сустрэнеш Новы год, так яго і правядзеш. Магчыма, гэта і ёсць той выпадак, калі можна праверыць дакладнасць народнай мудрасці.

У той час, калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, нам стала вядома, што кошт паездкі складае 30 долараў (і ніякіх рублёў). Шкада!

СНІД НЕ СПІЦЬ

## Пад нумарам 114

КАБІНЕТ ананімна-давяральнага абследавання на СНІД пры 33 (студэнцкай) паліклініцы пачаў працаваць з сакавіка 1990 года, калі ўжо было зразумела, што «капіталістычная» хвароба нас не абмінула.

За гэты час пажадалі праверыцца больш за 50 чалавек. Былі выяўлены вірусаносьбіты: у 1990 годзе два замежных студэнта, за дзесяць месяцаў 1991 года — таксама два замежнікі. Яны былі дэпартываваны. Крыху раней, у 1989 годзе, вірус ВІЧ быў выяўлены ў савецкай студэнткі БПІ, якая потым абследавалася ў Маскоўскім цэнтры па барацьбе са СНІДам.

Хворых СНІДам выяўлена не было.

Жадаючых праверыцца няшмат. Супрацоўнікі кабінета, дзе робяць забор крыві на СНІД, катэгарычна выказаліся супраць ананімнасці абследавання:

— Трэба, каб чалавек на абследаванне прыходзіў з пашпартам, тады наша праца не будзе дарэмнай і хворы са станоўчай рэакцыяй на вірус ВІЧ не знікне бясследна, не застанецца сам-насам са сваёй страшэннай таямніцай, — удакладніў урач-інфекцыяніст 33-й паліклінікі Г. М. Газенпуд.

Але гэтае перакананне не перашкаджае гаспадарам кабінета спакойна ставіцца да кожнага ананімнага наведвальніка.

Зусім іншая рэакцыя назіраецца з боку лабараторыі, куды адпраўляюць кроў на аналіз. Кроў ад ананімных пацыентаў даследуюць у два разы даўжэй, а 50 працэнтам «ананімшчыкаў» рэкамендуецца паўторны забор крыві. Цяпер уявіце сабе становішча чалавека, якому недвухсэнсоўна раюць яшчэ раз абследавацца. Гэта таксама адмоўнае дасягненне ананімнасці.

Але іншага выйсця няма. Пакуль не знойдзены эфектыўны сродак барацьбы са СНІДам, асуджаны чалавек не спяшаецца нават у ананімна-давяральны кабінет, дзе «ананімшчыка» памячаюць нумарам 114.

С. АЗАРЭВІЧ.

Ананімна-давяральны кабінет № 216 працуе штодзённа з 8.00 да 20.00, у суботу — з 9.00 да 18.00. Выхадны — нядзеля.

ПРЭС-АПЫТАННЕ

# Цана прадажная

*Лібералізацыя цэн — наяўная з'ява. Жадаеце даведацца, хто і як яе сустракае і ўспрымае?*

Спачатку — ЭКАНАМІСТЫ. Кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканамічных навук Аляксандра Іванаўна **БЕРАСНЕВА** і кандыдат эканамічных навук Алена Эдуардаўна **ВАСІЛЬЕВА** растлумачылі, што лібералізацыя цэн — гэта іх хістанне ў залежнасці ад попыту і прапановы на рынку.

Усё ўзаемазвязана. Калі мы гаворым пра рынак, імкнемся да яго, то, безумоўна, працэс лібералізацыі цэн трэба ўспрымаць як адзін з неабходных элементаў развіцця сапраўдных рынвачных адносін. Лібералізацыя ў гэтым сэнсе непазбежная.

Наша бяда ў тым, што зараз рынак знаходзіцца на самым раннім этапе свайго развіцця, калі распаўсюджаны найбольш пачварныя яго формы на ўзроўні «купі-прадай». Канешне, каб забяспечыць нейкі пражытачны мінімум на так званы спажывецкі кошык (перш за ўсё харчовыя прадукты) лібералізацыя павінна быць рэгуляванай. А калі надыдзе час, каб можна было ўздыхнуць нармальна, прадказваць вельмі цяжка.

Вось што думае пра працэс лібералізацыі цэн Святлана **ЛЯВОШКА**, студэнтка 3-га курса геаграфічнага факультэта:

— Гэта жахліва! І здаецца мне, што будзе яшчэ горш. Будзе яшчэ большае бязладдзе, чым зараз.

Валянціна Пятроўна **ЯРАМЧУК** працуе ў гардэробе БДУ другі месяц; з 1978 года — на пенсіі (дарэчы, пенсія, разам з кампенсацыяй, усімі надбаўкамі і г. д.,— усяго 208 рублёў, амаль як студэнцкая стыпендыя...):

— Грошай не хапае, хоць жыву я разам з дачкою. Ці пайшла б я працаваць у сваім узросце, калі б магла пражыць без гэтага? Як маладыя будуць жыць? Бог яго ведае...

Зінаіда Міронаўна **ЯРКІНА**, з 1984 года на пенсіі, гардэробшчыца (атрымлівае пенсію памерам 182 рублі — з усімі надбаўкамі):

— Хто толькі прыдумаў гэтыя цэны! Куды ідзем?..

Рэм Іосіфавіч **ВАДЭЙКА**, загадчык кафедры псіхалогіі:

— Неабмежаваны рост цэн прадугледжваецца як стымул да павелічэння таваравытворчасці, якаснага паляпшэння тавараў і стабілізацыі эканомікі. Па меры насычэння спажывецкага рынку таварамі, як лічаць прыхільнікі лібералізацыі цэн, цэны на тавары будуць зніжацца. Я не эканаміст, але мяркую, што нельга спадзявацца на зніжэнне бязмерна раздутых цэн у бліжэйшым будучым, бо павелічэнне таваравытворчасці патрабуе зладжанай эканамічнай сістэмы. У нас жа ідзе працэс разбурэння адзінай эканомікі. І калі зараз пустыя паліцы магазінаў выклікаюць прыгнечаны стан у радавых працаўнікоў, то ў далейшым гэта захаваецца і ўзмацніцца, таму што нават пры наяўнасці тавараў празмерная дарагоўля не дазволіць прастому смяротнаму іх набыць.

Адмоўны эмацыянальны стан зніжае прадукцыйнасць працы, робіць чалавека раздражнёным, выклікае міжасабовыя і міжгрупавыя канфлікты, як на вытворчасці, так і па-за ёй. Далейшае расслаенне грамадства на мільёны бедных і сотні багатых прывядзе да росту злачыннасці. Дэфіцыт тавараў і іх дарагавізна ўжо зараз у многім вызначаюць абвастрэнне нацыянальных адносін, што нараджае нацыянальную замкнёнасць. У асобным чалавеку стымулюецца развіццё такіх якасцей характару, як прагнасць, хцівасць, індывідуалізм, бязлітаснасць, ілжывасць, беспрынцыпнасць.

Па законах псіхалогіі, чалавек, які трапіў у экстрэмальную сітуацыю, з якой ён не бачыць выхаду, перажывае стан фрустрацыі. У людзей з моцным тыпам нервовай сістэмы фрустрацыя, як правіла, выяўляецца ў форме агрэсіі, а са слабым — у выглядзе дэпрэсіі. Народы нашай краіны ўжо даўно ўвагнаныя ў стан масавага стрэсу і фрустрацыі. Частка грамадства мітынгуе, праводзіць забастоўкі, разбурае помнікі, у некаторых рэгіёнах ідзе грамадзянская вайна, ліецца кроў. Іншыя ж людзі страцілі веру ў будучае, цікавасць да жыцця, да работы, да сям'і, сталі абыякавымі да ўсяго. Сярод іх расце колькасць самазабойцаў.

Думаю, што гэтыя тэндэнцыі ў сувязі з павышэннем цэн на тавары пры разбуранай эканамічнай сістэме ў нашай краіне могуць узрастаць.

Прагнозы збірала
Таццяна **КАЗАК**.

У БАГАТЫХ СВАЕ ЗВЫЧКІ

# АГЕНСТВА ПРАПАНУЕ БЯСПЕКУ





*У лістападзе на базе алімпійскага спорткомплекса ў Стайках пачалі работу спецкурсы па падрыхтоўцы прафесійных целаахоўнікаў. У снежні з'явяцца іншыя — па самаабароне для жанчын. Заняткі арганізаваны агенствам «Сюртэ».*

*Агенства дзейнічае на камерцыйнай аснове — атрымлівае грошы за кожную паслугу. У ім працуюць былыя супрацоўнікі МУС, КДБ, АМОНа... Попыт вялікі і працягвае расці. Багатыя людзі і прадпрыемствы аддаюць перавагу бяспецы ў наш трывожны час. Міліцыя не ў стане забяспечыць яе ўсім. Пад аховай «Сюртэ» знаходзіцца, напрыклад, увесь комплекс грамхарчу ў Траецкім прадмесці, а таксама многія склады, камерцыйныя магазіны і кіёскі ў розных раёнах Мінска. Супрацоўнікі агенства могуць суправаджаць грузы ў іншыя рэгіёны краіны.*

*Заняткі на курсах пачалі 30 чалавек.*



ГУТАРКА З НАГОДЫ...

# АБ ХЛЕБЕ НАДЗЁННЫМ

**Звярнуцца да дырэктара 33-й сталовай Галіны Раманаўны ПЛЮХІНАЙ нас падштурхнулі чуткі аб тым, што з-за недахопу прадуктаў і іх дарагоўлі закрылі студэнцкую сталовую БПА.**

**— Галіна Раманаўна, а можа здарыцца, што заўтра, праз тыдзень, праз месяц і нашу сталовую прыйдзецца закрыць ?**

— Мне здаецца, такога не здарыцца. Запасы прадуктаў на базах яшчэ ёсць. Канешне, могуць узнікнуць перабоі з пастаўкай агародніны (скажам, кілаграм цыбулі зараз каштуе больш за 5 рублёў). Але голаду, давайце спадзявацца, не будзе.

**— Пакуль што ў студэнцкіх сталовых цана самая нізкая...**

— Зразумела. Студэнцкія сталовыя самай нізкай, трэцяй, катэгорыі. Пасля красавіцкага павышэння цэн Савет Міністраў Беларусі ўстанавіў 30-працэнтнае павышэнне цэн на прадукты для сталовых гэтай катэгорыі. Яшчэ ў красавіку мы хваляваліся, што паніжзіцца тавараабарот, аднак дарэмна — ён наадварот павысіўся. Народу ў студэнцкіх сталовых папрыбавілася. Гэта, напэўна, можна растлумачыць тым, што ў магазінах, на жаль, амаль нічога не знойдзеш.

**— Ці падаражае харчаванне ў нашай студэнцкай сталовай?**

— Я думаю, што ў наступным годзе, у сувязі з лібералізацыяй цэн — падаражае. Але, напэўна, і стыпендыя павялічыцца...

**— А якія праблемы паўстаюць перад вамі сёння?**

— Як гэта ні празаічна на першы погляд, але самая сур'ёзная праблема ў тым, што не хапае посуду, не даюць нам ужо ні лыжак, ні відэльцаў. Куды яны знікаюць? У мяне ёсць падазрэнне, што многія «інтэрнатаўцы» «запазычылі» іх у нас.

**— Галіна Раманаўна, а што вы можаце параіць, прапанаваць тым студэнтам, якія, напрыклад, маюць неабходнасць правесці нейкае асабістае свята, дзень нараджэння ці вяселле?**

— Няхай звяртаюцца да нас, робяць заказы — калі ласка. Заўсёды будзем рады дапамагчы, чым зможам.

Т. **КАЗАК**.

ПА СЛЯДАХ АДНОЙ АБ'ЯВЫ

# ПРАМЕНЬ СВЯТЛА Ў ЦЬМЯНЫМ ЦАРСТВЕ

***Стоп! Не чытайце аб'яў, а тым больш не ўздумайце хадзіць на лекцыі, калі аб'ява дакладна прапануе паслухаць пра «адзінства і супрацьлегласць ведаў Усходу і Захаду». Вы рызыкуеце патрапіць... незразумела куды.***

Таму што на лекцыі, якая мела месца якраз у той дзень, што і значыўся ў аб'яве, пра «адзінства» не было і гуку, як і пра «нараджэнне прыроды, чалавека і грамадства». Лектар, напэўна, з-за ўзбуджанасці пачаў не з таго канца ды так і пакінуў. Спачатку ён пералічыў усе нашы жыццёвыя анамаліі, накшталт НЛА, палтэргейстаў, ведзьмакоў, астролагаў і іншых з варожага племені, пасля чаго прагучала шматзначнае: «Будзе яшчэ цяжэй». Гэта было сказана глуха і з намёкам на безнадзейнасць, якая тут жа адбілася на слухачах.

Аднак ёсць выратаванне — вядома, наш лектар ведаў тую панацэю. Ён распачаў здалёк. Слухачы памалу напітваліся нечуванай інфармацыяй пра сем стыхій (няздатныя матэрыялісты прызналі толькі чатыры, але і ў тых здолелі заблытацца), пра трохмернасць часу (аказалася, што гэта таксама матэрыя), пра складаны пераход агню ў святло і яшчэ шмат цікавых і вартых увагі рэчаў. Усё гэта падавалася з націскам, з пафасам і з шырокім спектрам інтанацый — ад бацькоўскіх да глухога ўшчувальнага хрыпу, што крыху кампенсавала ўражанне ад змястоўнага «вінегрэту» лекцыі. Здавалася, што тут не лекцыя, а баксёрскі рынг, дзе вам спраўна стукнуць па галаве, каб вы неадкладна прызналі перавагу апанента.

Я забылася сказаць, што слухачы на гэты раз натоўпу сабой не ўяўлялі. З дзесятак размеркаваўшыхся па ўсёй зале чалавек моўчкі слухалі... Папуры з лакальных філасофскіх ісцін у своеасаблівай камбінацыі некага выяўна прывабіла, кагосьці насцярожыла. Неўзабаве разам з намі, так і не даслухаўшы да лагічнага заканчэння, з залы вырвалася дзяўчына, і мы пачулі яе саркастычнае: «Ён жа сам сябе заблытае...» Дзяўчыну можна зразумець. Усе мы зараз упарта, у тым ліку і падсвядома, шукаем Ісціну. Хто ж вінаваты, што сёння ёй не пашанцавала?

Відавочна, што духоўны голад не лягчэйшы за фізічны. Калі ўнутры варушацца шматлікія пытанні, на якія чалавек не мае адказаў, узнікае прага чагосьці, што задаволіла б, супакоіла, а што гэта можа быць — чалавек яшчэ не ўсведамляе. Тады ён ідзе. На такія вось лекцыі, на кухню да сяброў, прыхапіўшы з сабой фунт ежы, на нейкія там дыспуты, секцыі... Пашанцуе — ён знойдзе аднадумцаў ці такіх жа шукальнікаў, ці прачытае нешта кранаючае, ці жыццё з літасцю павернецца да яго светлым бокам — і аднойчы ён адчуе надзею на адказ, ён ПАВЕРЫЦЬ.

Іван Яфрэмаў, фантаст і падарожнік-навуковец, калісьці напісаў, што рэлігія становіцца верай толькі ў адным выпадку: калі яна — гэта водгук уласнага ўнутранага стану чалавека (таго, што мы завем «асобай»). Вера адчыняе яму такую з'яву, як унутраны свет, і дае перспектыву ўнутранага росту.

Можа, таму ў Індыі дагэтуль распаўсюджана традыцыя духоўнага настаўніцтва, а ў Расіі калісьці пры манастырах жылі старцы, якімі захапіўся Ф. М. Дастаеўскі, ствараючы «Братоў Карамазавых». На так званы індывідуальны падыход да душы, зацямнёнай, знемагаючай у пошуках святла (у якое трэба верыць, каб дайсці), былі здольны толькі людзі вышэйшага духоўнага ўзроўню, такіх на Русі называлі святымі або падзвіжнікамі.

Напэўна, таму, хто знаёмы з высокім маральным узроўнем адносін Настаўніка і вучня, смешна ці балюча было б глядзець на масавы маштаб перадачы такіх ведаў, якія раней даваліся толькі падрыхтаваным, у тым ліку маральна. Бо ўсякі настаўнік нясе адказнасць за вучня. Эзатэрычны, некалі тайны пласт ведаў чалавецтва, які раней быў дасягальны толькі для выбраных, цяпер распаўсюджваецца. Але можна разгубіцца ад такой колькасці кніг, секцый, прамоўцаў, школ «экстрасенсорыкі і парапсіхалогіі» і сярод гор публікацый. Гэта цікавая з'ява, але даволі цьмяная, на мой погляд.

Н. **ЖУК**.

НА ПЛАНЕЦЕ ЗЯМЛЯ

# БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ

## ВА ЎНІВЕРСІТЭТ

**МАЕЦЦА НА ЎВАЗЕ НЕ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ, А АДКРЫТЫ ЭКАЛАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ. 2 ГАДЫ ВУЧОБЫ — І ВАС ЧАКАЕ ДЫПЛОМ ЭКСПЕРТА-ЭКОЛАГА. ЯК ТРАПІЦЬ У ГЭТУ НОВУЮ НАВУЧАЛЬНУЮ ЎСТАНОВУ І ЧАМУ ТАМ ВУЧАЦЬ? АБ ГЭТЫМ ВОЛЬГА ФІЛАТАВА ГУТАРЫЦЬ З РЭКТАРАМ АДКРЫТАГА ЭКАЛАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА ПРАФЕСАРАМ ВАЛЕРЫЕМ САМСОНАВІЧАМ ПЕТРАСЯНАМ.**

***— Здаецца, Юрый Алеша сказаў: у Ленінградзе кожная вуліца імкнецца стаць праспектам. Сёння «эпідэмія велічы» захапіла, здаецца, нашы вучэбныя ўстановы: школы становяцца гімназіямі ці ліцэямі, ВНУ — акадэміямі ці універсітэтамі. Прашу прабачэння, але «адкрыты экалагічны» таксама не хоча адставаць ад моды?***

— Справа, між тым, не ў назве. Але экалогія сёння, на жаль, ператвараецца ў моду, аб яе праблемах разважае кожны. Можа, само па сабе гэта і нядрэнна, калі б людзям не здраджвала пачуццё меры. А нярэдка ж уключыш тэлевізар ці адкрыеш газету, а там такія «адкрыцці» — хоць за галаву хапайся. У многіх жа ў крыві звычка «ад і да» давяраць сродкам масавай інфармацыі, вось і прымаюць за ісціну пачутае ці прачытанае. Небяспека няправільнай арыентацыі грамадскай думкі ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага прыродакарыстання велізарная. Супрацьстаяць гэтай модзе мы і хочам. Таму створаны Адкрыты экалагічны універсітэт.

Чаму менавіта універсітэт, а не лекторый ці курсы? Варта, напэўна, напомніць: з латыні «універсітэт» перакладаецца як супольнасць, сукупнасць. З аднаго боку, мы імкнемся даць сукупнасць ведаў аб прыродзе, з другога — кантынгент слухачоў — гэта своеасаблівая супольнасць людзей, якія будуць кампетэнтныя не толькі ў сваёй спецыяльнасці, але і адукаваны экалагічна. А значыць, мы зможам у будучым у нейкай меры быць застрахаванымі ад горкіх памылак у сваіх адносінах да прыроды.

Вядомы нямецкі біёлаг мінулага стагоддзя Эрнст Гекель вызначаў экалогію як «агульную навуку аб зносінах жывых арганізмаў з навакольным асяроддзем, куды мы адносім у шырокім сэнсе ўсе ўмовы існавання». Традыцыйна экалогіяй займаліся і працягваюць займацца галоўным чынам біёлагі. І хаця біялогія з часоў Гекеля зрабіла гіганцкі рывок у сваім развіцці, сёння немагчыма комплексна і глыбока даследаваць прыродныя працэсы без фізікі, хіміі, геаграфіі і многіх іншых прыродазнаўчых навук. Для рашэння ж экалагічных праблем неабходны і гуманітарныя — эканоміка, права, філасофія, псіхалогія, сацыялогія... Карацей, сучасная экалогія — складанейшы сінтэз навук. І адукаваць экалагічна вельмі складана. У МДУ, напрыклад, комплексны курс не чытаецца ні на адным з факультэтаў, а экалагічныя веды — няма патрэбы растлумачваць чаму — востра неабходны спецыялісту ў якой бы галіне ён ні працаваў.

Словам, пяць гадоў назад у нас паявілася ідэя прачытаць курс для студэнтаў усіх факультэтаў «Сучасныя праблемы ўзаемаадносін чалавека і біясферы». Пазней былі арганізаваны выязныя экалагічныя школы ў некалькіх гарадах Расіі, у Латвіі, Казахстане. А ў мінулым годзе адбыўся першы набор слухачоў у Адкрыты экалагічны універсітэт пры МДУ. Цяпер, дапрацаваўшы методыку выкладання, у верасні пачынаем новы прыём.

***— Якая праграма навучання?***

— Яна разлічана на два гады. У першы — чытаем лекцыі па агульнай экалогіі, геа- і хімічнай экалогіі, эканоміцы прыродакарыстання, экалагічнаму заканадаўству, глабальных праблемах сучаснай экалогіі. Другі год — гэта семінарскія, лабараторныя заняткі, удзел у камп'ютэрных гульнях і канкрэтных экалагічных экспертызах. Лекцыі чытаюць акадэмік АН СССР Н. Н. Маісееў, прафесары МДУ С. Н. Бобылеў, Г. Н. Голубеў, В. Н. Максімаў, В. С. Петрасян, Г. С. Хозін і іншыя. Па заканчэнні курса, здаўшы экзамены, слухачы атрымліваюць дыплом з прысваеннем кваліфікацыі эксперта-эколага. Дарэчы, Дзяржкампрырода і Саюза, і Расіі гатова дапамагчы ў працаўладкаванні выпускнікам МДУ, якія маюць і другі дыплом — Адкрытага экалагічнага універсітэта.

***— Значыць, Адкрыты універсітэт як бы асобны факультэт МДУ, дзе студэнты набываюць другую прафесію?***

— Не. Хаця мы спачатку задумвалі вучыць менавіта нашых студэнтаў. Але сярод слухачоў суадносіны аказаліся 50 на 50: у нас займаецца моладзь з іншых ВНУ, рабочыя, служачыя, ёсць нават... два прафесары. Словам, дзверы адкрыты для ўсіх, хто хоча атрымаць бясплатную экалагічную адукацыю.

***— Зараз, калі нараджаюцца рыначныя адносіны, мы пачынаем пакрысе прывыкаць да таго, што за ўсё трэба плаціць. За кошт якіх жа сродкаў будзе існаваць універсітэт? Каб прыцягнуць акадэмікаў і прафесароў, патрэбны грошы, і немалыя.***

— Наш спонсар — творча-вытворчае аб'яднанне «Саюзэкасервіс», якое лічыць справай гонару ўкладваць частку свайго прыбытку ў экалагічную адукацыю.

Другое — у гэтым навучальным годзе ў нас будуць чытаць лекцыі і замежныя спецыялісты. Напрыклад, прафесар А. Рэнцоні з Італіі — па агульнай экалогіі, прафесар Дж. Хорнік з ЗША — па хімічнай экалогіі, міністр О. Салаберы з Аргенціны — па экалагічнаму праву. Ідуць перагаворы, каб у будучым годзе курс цалкам прачытала «амерыканская каманда» спецыялістаў. Гэта дабрачынная дзейнасць нашых партнёраў.

***— Мне гаварылі, экалагічны універсітэт у многім абавязаны сваім нараджэннем рэктару, падзвіжніку экалагічнай адукацыі В. С. Петрасяну. Як атрымалася, што Вы — хімік, а не біёлаг ці географ, так захапіліся аховай прыроды?***

— У 1975 годзе мяне запрасілі як хіміка ў састаў экспедыцыі на навукова-даследчае судна «Маскоўскі універсітэт» для работы ў Атлантыцы. Мы вывучалі змест арганічных таксікантаў, паралельна даследуючы біялогію вод акіяна. Потым былі новыя навуковыя экспедыцыі: Міжземнае, Чорнае мора, Байкал... У рэшце, я зрабіўся хімікам-эколагам.

***— Ваш факультэт рыхтуе спецыялістаў для той самай галіны, што ў ліку першых забруджвальнікаў прыроды. Ці рэалізуеце Вы сваю другую прафесію ў выкладчыцкай дзейнасці?***

— І не толькі ў выкладчыцкай. У лабараторыях кафедры вядзём вялікую навукова-даследчую работу па экалогіі.

Экалагічныя праблемы надзвычай складаныя з навуковага пункту гледжання. Неспецыялісту асобныя з іх могуць падацца незаўважнай дробязю, а па сутнасці яны маюць глабальнае значэнне. Адзін з прыкладаў — якасць вады. На праццягу навуковых даследаванняў мы звярнулі ўвагу на такую цікавую з'яву. Прымітыўна кажучы, правялі эксперымент: узялі 10 розных рэчываў, дадалі ў дыстыляваную і рачную ваду. Растварылі. У першай — усе 10 аказаліся ў наяўніцтве, а ў прыроднай — многія зніклі.

***— «З'елі» іх прымесі-забруджвальнікі, якія ёсць у рачной вадзе?***

— Не. У прыроднай вадзе ёсць асаблівыя гумусныя рэчывы. Гэта — разгалінаваныя біяпалімеры, яны маюць у сваёй структуры поласці, у якіх дадзеныя намі рэчывы і аказаліся быццам бы «зачыненымі». А зменіцца саленасць ці кіслотнасць, палімеры «раскручваюцца» і выпускаюць сваіх палоннікаў са зняволення. Інакш кажучы, мы можам лічыць прыродную ваду чыстай, а вып'е яе чалавек і створыць сур'ёзную пагрозу для асабістага здароўя. Існуючыя метады кантроля якасці вады аб такой «каверзе» і не падазраюць... А вазьміце хлараваную ваду з-пад крана. Гумусныя рэчывы ў ёй разбураны. Хлор, забіваючы патагенных бактэрый, паразіты, вірусы, робіць быццам бы добрую справу. Але з'яўляюцца хлораарганічныя спалучэнні, механізм іх утварэння вывучаны пакуль слаба, і невядома, якую небяспеку, зноў жа, яны нясуць здароўю. Аспірантка нашага факультэта Н. Траццякова і студэнтка Н. Яшчанка зараз вядуць даследванні механізму ўтварэння хлорарганічных злучэнняў у Дармутскім каледжы, у адным са старэйшых амерыканскіх універсітэтаў, які, дарэчы, быў створаны за 7 гадоў да ўтварэння ЗША.

***— А чаму ў ЗША? У нас няма ўмоў для такіх даследаванняў?***

— У факультэта дагавор з гэтым каледжам аб абмене студэнтамі і аспірантамі. У летні перыяд лабараторыі свабодныя, і тэхнікай можна карыстацца бясплатна. А ў нас на факультэце толькі адна такая ўстаноўка, дарэчы, амерыканская, і яна вельмі перагружана.

Такім чынам — гэта толькі адзін прыклад (а іх можна прывесці мноства), які даказвае наглядна, як неабходна сёння ведаць «нюансы» працэсаў, што адбываюцца ў прыроднай вадзе. І не толькі ў вадзе. Таму мы і «экалагізуем» традыцыйныя курсы лекцый...

***— А слухачам Адкрытага універсітэта таксама даюцца спецыялізаваныя веды?***

— А як жа!

***— Але ж адна справа, калі перад лектарам аўдыторыя хімікаў ці біёлагаў і зусім іншае, калі яна разнашэрсная. Вы ўпэўнены, што ідэі, якія хочаце ўкласці, засвояць філолаг ці псіхолаг?***

— Мы сапраўды паміж Сцылай і Харыбдай: з аднаго боку, нельга спрошчваць веды, бо грош цана будзе такой «адукацыі», з другога — грозная небяспека неразумення. Таму і робім стаўку на лектараў самай высокай кваліфікацыі. Памятаеце, як сказаў Мендзялееў: няма ў навуцы такой тэорыі, што не можа быць засвоена пяцігадовым дзіцём. Пытанне ў тым, як падаць матэрыял. Наш курс — не на ўзроўні школы, гэта сапраўды сур'ёзная адукацыя.

А для спецыялістаў створаны гасразліковы экалагічны Цэнтр павышэння кваліфікацыі.

***— Цяпер, калі прадпрыемствы падлічваюць кожны рубель, ці не адчуваеце вы недахоп у слухачах цэнтра?***

— Попыт на эколагаў надзвычай высокі. Па-першае, прынятыя ў апошні час законы, нарматыўныя акты так ці інакш прымушаюць прадпрыемствы павярнуцца тварам да экалогіі. І яны пастаўлены ў сітуацыю, калі больш выгадна заплаціць за падрыхтоўку спецыяліста і дзейнічаць экалагічна граматна, чым выкладваць буйныя штрафы.

***— Адкрыты універсітэт, цэнтр — вельмі добра. Але кажуць, экалагічную адукацыю лепш за ўсё пачынаць з дзіцячага садочка.***

— Паралельна экалагічным навучаннем займаецца Маскоўскі незалежны інстытут экалогіі, канфліктaлогіі і адкрытай адукацыі. Праўда, там за вучобу трэба плаціць.

***— Найрад ці пры нашай усеагульнай беднасці колькасць жадаючых атрымаць экалагічную адукацыю за грошы будзе вялікая. Тым больш, мне цяжка ўявіць бацькоў, якія аддадуць кругленькую суму за тое, каб іх дзіцяці растлумачылі, што ёсць прырода...***

— Так, праблем тут шмат, але не можа ж МДУ узяцца за ўсё. Але ў перспектыве мы хочам, маючы цэнтр і Адкрыты універсітэт, ствараць і школу юнага эколага. Магчыма, нават яе разгалінаваную сетку, падобную на тую, што была арганізавана ў свой час акадэмікам А. Н. Калмагоравым для асаблівa адораных дзяцей па матэматыцы. Але пакуль гэта справа будучага. Ні адзін факультэт МДУ не зможа ў адзіночку ўзняць грамадскую сістэму экалагічнай адукацыі — тут непазбежная дылема: або дылетанцтва, а значыць — хаўтура, або ўзровень, на які, каб выйсці, патрэбны час. Экалагічныя ж адукацыя ў нашай краіне робіць толькі першыя сур'ёзныя крокі.



Фота С. ГРЫЦА.

# МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

Ён загінуў загадкава. Можа, выпадковая была гэта смерць пад коламі цягніка, можа, самагубства. Хутчэй, апошняе... Ён не быў прызнаны афіцыйна як таленавіты мастак: ніякіх ганаровых званняў і іншых праяў пашаны не меў. Відаць, менавіта таму многія ведаюць цяпер яго імя — Канстанцін **ВАСІЛЬЕЎ**.

Выстаўка яго работ, якая адкрылася ў Мінску 8 лістапада, стала падзеяй, якімі мы не спешчаны ў апошні час. Можна было б не мець сумненняў наконт гэтага, але... Уладзімір Аляксандравіч Феакцістаў, намеснік старшыні Маскоўскага клуба аматараў Васільева, які прывёз нам гэту выстаўку, сцвярджае, што нідзе раней яна не мела да сябе такой халаднаватай увагі, як у Мінску — ні ў Новасібірску, ні ў Краснаярску, ні ў Кіеве, ні ў Рызе. У нас адкрыццё выстаўкі сустрэла сціплая рэклама і сціплая колькасць наведвальнікаў выставачнай залы Палаца мастацтваў. Уладзіміра Аляксандравіча вельмі здзівіла гэта акалічнасць — раней ён быў упэўнены, што дух работ Васільева павінен быць блізкі беларусам.

Напэўна, усё ж такі блізкі. Бо ў кнізе водгукаў у асноўным захопленыя словы. «Дзякуй за сустрэчу ля вакна ў іншы, чысты свет» — гэта рэфрэн амаль усіх пачуццяў, якія захацелі пакінуць на паперы мінчане. Практычна ніхто з іх не бярэцца аналізаваць асаблівасці творчага почырка ці ступень прафесіяналізму работ Васільева — большасць выказваюць чыста чалавечае ўзрушэнне ад сустрэчы з імі.

Часта сустракаецца ў кнізе водгукаў дзіцячы почырк. Увесь клас сярэдняй школы, двое падлеткаў, дашкольнік, праз шкляныя дзверы, але спачатку — копія...

Відаць, дзеці сапраўды больш геніяльныя, чым дарослыя, у непасрэднасці свайго ўспрымання. Іх душы больш чыстыя, каб адчуць, калі стаіш ля палатна, як ліецца з яго энергія, пакінутая аўтарам. Добрая энергія — бо пайсці адсюль не хочацца. Можна дазволіць сабе пафантазіраваць і ўявіць, як мастак ствараў гэта, якімі былі яго вочы, рухі, поза... І раптам убачыць сябе на яго месцы, пранікнуцца ўпэўненасцю, што ты таксама можаш стаць мастаком

# ДЗЕЦІ НЕ ЛЮБЯЦЬ РЭПРАДУКЦЫЙ



які пакінуў замест подпісу крамзолі пад мамінымі радкамі. І вось гэты запіс: «Мне вельмі спадабаліся карціны. Я хачу навучыцца маляваць як мастак Васільеў. Вучань 3 «Ж» класа СШ № 160 Ю. Лапіцкі». У зале амаль заўсёды ёсць дзеці. Ім сапраўды цікава бачыць «жывыя» карціны, часам больш цікава, чым многім дарослым.

Каля касы адна дама інтэлігентнага выгляду пераконвала сваю сяброўку: «Давай не пойдзем на Васільева. Рэпрадукцыі ў яго вельмі прыгожыя, а самі карціны нейкія бляклыя...» Даволі тыповае ўяўленне, бо ўсе мы спажываем многа сінтэтычнага: і з ежай, і з падробкамі пад мастацтва. У апошні час выпушчана мноства якасных рэпрадукцый Канстанціна Васільева — календароў, паштовак, буклетаў, плакатаў. Прадаюцца яны і тут, на выстаўцы. Многія выбіраюць і купляюць рэпрадукцыю, яшчэ не ўбачыўшы яе арыгінала. Ён тут, побач, нават відаць «як Васільеў».

Лепшыя рэпрадукцыі захоўваюць настрой арыгіналаў. Але аўтар у іх, як правіла, адсутнічае. З копій не ліюцца гукі музыкі, у суправаджэнні якой Канстанцін Васільеў напісаў большасць сваіх карцін, не толькі партрэты кампазітараў. Копіі мала гавораць пра яго лёс. Паглядзіце на арыгіналы двух аўтапартрэтаў мастака — 1970-га і 1976-га, апошняга, гадоў — і вы даведаецеся пра гэтага чалавека больш, чым у тым выпадку, калі пазнаёміцеся з рэпрадукцыямі ўсіх яго работ (у Васільева іх каля 400). Юныя адчуваюць гэта. Дарослыя — не заўсёды.

Магчыма, калі сённяшнія дзеці стануць дарослымі, яны таксама страцяць гэты дар. А можа, у іх час Мінск перажыве сапраўднае паломніцтва на выстаўку Васільева... Дакладна, што тады будзе ўжо існаваць яго музей у Маскве. У. А. Феакцістаў паведаміў, што зараз вядуцца работы ў асабняку, які купле-ны для музея ў Ціміразеўскім раёне Масквы. Раптам будучае прынясе нам разгадку ўсіх таямніц жыцця Васільева? Пакуль іх застаецца даволі многа.

Сам Канстанцін Аляксеевіч амаль ніколі не даваў назвы сваім работам. Гэта рабілі яго родныя і сябры. Магчыма, карціну «Сястра Людзміла» ён назваў бы інакш. Цяпер здаецца невыпадковым тое, што ён намаляваў сястру ў чорнай сукенцы і з нейкімі сумнымі для такой прыгажосці вачыма. Людзміла загінула праз некалькі гадоў пасля брата — заразілася смяротнай інфекцыяй, калі купалася ў забруджаным возеры...

Зрэшты, можа не ўсе загадкі патрабуюць расшыфроўкі. Нават пасля таго, як будуць высветлены ўсе біяграфічныя даныя, і буйныя палотны, і маленькія малюнкі, і графічныя эскізы Васільева застануцца пакрытымі Таямніцай Творчасці.

Ніводнай сваёй работы ён не прадаў, хаця заўсёды меў патрэбу ў грошах. Працаваў нават лабарантам у абсерваторыі. Назіраў за зоркамі, імкнуўся да іх, але потым усё роўна вяртаўся да зямных тэм. Так сведчыць дакументальны фільм, які дэманструецца ў канферэнц-зале. Палаца мастацтваў.— «Васільеў з Васільева».

Вы ўбачыце яго, калі наведаеце выстаўку не пазней, чым 1 снежня, у дзень яе закрыцця. У экспазіцыі прадстаўлены ўсе асноўныя тэматычныя цыклы і жанры, у якіх працаваў Канстанцін Васільеў. Потым яна накіруецца ў Варонеж, у Санкт-Пецярбург, у Францыю. Калі ў наступны раз з'явіцца ў Мінску — невядома.

В. БЯГУН.

НА ЗДЫМКАХ: рэпрадукцыя карціны К. Васільева «Чаканне».

Фота С. ГРЫЦА.

## ~~ЗАТРЫМКА~~ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У 1961 годзе пад час вучобы на Вышэйшых сцэнарных курсах у Маскве Уладзімір Караткевіч напісаў кінасцэнарый «Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны». Кінастудыяй «Беларусьфільм» двойчы (у 1970 і ў 1983 гадах) прадпрымаліся спробы зрабіць па гэтаму сцэнарыю фільм. Але скончыліся яны беспаспяхова, таму што кіраўніцтва Дзяржкіно БССР лічыла, што ў беларускім кінематографе не трэба ўздымаць рэлігійную тэматыку.

На пачатку гэтага года пачалася праца над фільмам, але з першага кастрычніка «Легенда аб бедным д'ябле» закансервавана. Як сказаў мне рэжысёр-пастаноўшчык Юрый Марухін, галоўная прычына кансервацыі — фінансавая. На пастаноўку карціны было выдзелена ўсяго 1,5 мільёна рублёў, у той час, як патрэбна не менш чатырох з паловай. Для прыкладу: кошт адной толькі кінастужкі складае 800 тысяч рублёў, на выдзеленыя грошы нельга нават пабудаваць дэкарацыі. Пытанне пра аднаўленне працы над фільмам будзе ўзнята ў наступным годзе. Пакуль жа дырэкцыя «Беларусьфільма» шукае спонсара.

Ягор КОНЕЎ.

## РУСКІ ВАРЫЯНТ ЭРОТЫКІ

На творча-вытворчых аб'яднаннях «Аркадыя» і «Вандроўнік» зняты «першы савецкі афіцыйны эратычны» фільм. Рэжысёр — Алена Нікалаева, сцэнарый — Аляксандра Рудакова на матэрыяле «Казкі» Уладзіміра Набокава. Галоўныя ролі выконваюць Людміла Гурчанка (ужо ёсць меркаванні, што гэта яе лепшая роля ў кіно) і папулярны «гардэмарын» Сяргей Жыгуноў.

У эратычным фільме цалкам адсутнічаюць эратычныя сцэны. Гэта дазваляе назваць яго сапраўды рускім варыянтам такога кінематографа. Тым не менш, стужка названа «Секс-Сказка». Можна спадзявацца, што «СекСказка», якая на самой справе стала казкай без секса,— лепшы прыклад экранізацыі класічных твораў.

# ПІШУ КАРЦІНЫ КВЕТКАМІ

Пранізліва ярка палае сонечны шар. Быццам німб, вянчае ён галоўкі дзвюх пурпурна-ружовых хрызантэм, якія пяшчотна схіліліся адна да адной. Яе Вялікасць Каханне. І трапяткімі пялёсткамі, кожным лісцікам, кожнай галінкай цягнуцца ўвысь бялюткія рамонкі — светлыя зорачкі надзеі. Каханне прыходзіць толькі да чыстых душой, пазбаўляе нас карыслівасці, зайздрасці, эгаізма і абуджае вечны кліч жыцця — да самаўдасканалення...

Гэта кампазіцыя з засушаных раслін «Пуцяводная зорка» мастака-фларыста Галіны **САКАЛОЎСКАЙ**. Работы мінчанкі з поспехам дэманстраваліся на шматлікіх выставах у нашай краіне і за мяжой: у Польшчы, Чэха-Славакіі, Германіі.

— **Галіна, фларыстаў называюць яшчэ «мастакамі без пэндзаля і акварэлі».**

— Небеспадстаўна. У нас у руках фарбы самой Прыроды: расліны, кара дрэў, асабліва бяроста, апалае лісце, сухія галінкі, тапаліны пух, рознае скарлупінне, жалуды, каштаны, семя, імхі, лішайнікі... Разнастайнасць прыроднага матэрыялу бязмежная, магчымасці — багацейшыя, усё залежыць ад вашай творчай індывідуальнасці, вашай фантазіі, вашага светаразумення. Я пішу карціны кветкамі.

— **Як вы адкрылі для сябе фларыстыку?**

— Вельмі празаічна. Шукала падарунак на дзень нараджэння і ўбачыла ў «Паўлінцы» пано з засушаных раслін. Прыгледзелася больш уважліва: тэхналогія выканання, здаецца, нескладаная. Вырашыла паспрабаваць, і вось... 14 год неразлучная з кветкамі.

— **А першы блін...**

— Не, ён не аказаўся комам. Цудоўная барвовая ружа на цёмна-сінім аксаміце, а побач, быццам у павеве ветру, рамонкі і незабудкі. Гэта пра нас, жанчын,— усе мы і капрызныя прыгажуні-ружы, і чыстыя ў каханні рамонкі, і адданыя ў сяброўстве незабудкі. Работа ў ліку іншых адбіралася на выставы.

— **Галіна, у вас каля 40 кампазіцый. І кожная непаўторная, адметная і па мастацкіх вартасцях, і па задуме, і па ўнутранаму «я»...**

— Так, мой стыль — эмацыянальна-асабовы, а паколькі немагчыма чалавеку ніяк, нават па самай гарачай просьбе, паўтарыць свой душэўны стан, то і мае работы па іх «унутранаму духу» проста не могуць быць падобнымі. Я, прызнаюся, колькі ні спрабавала, ні разу не здолела зрабіць больш-менш адпаведнай копіі са сваіх карцін... Да іншых работ пішу лірычныя суправаджэнні: яны непадзельныя з карцінай, толькі з імі кампазіцыя гучыць, размаўляе з людзьмі, кліча іх да асэнсавання сябе, іншых, Зямлі, Сусвету...

«Мы забыли слово «любовь»  
в истинном его значении.  
Мы только учимся любить.  
Свет любви — это та путеводная  
звезда,  
которая помогает нашей душе  
сбросить оковы корысти, зависти,  
эгоизма  
и обрести свободу.  
Сила любви так велика,  
что сияньем своим разрушает тьму,  
пронизывая землю светом  
чистоты и радости,  
гимном вечной Любви,  
а значит — вечной жизни...»

Гэта радкі да «Пуцяводнай зоркі». Глыбінная элегічнасць побач з уяўнай прастатой сюжэта.

— **Падзяліцеся сакрэтам: як сярод мноства разнастайных кветак і раслін вам удаецца адшукаць адзіна «тыя»?**

— Маё ўнутранае перакананне: расліны, кветкі, як і мы, людзі,— часцінка Прыроды; гэта нашы адзінанароджаныя, малодшыя браты. І яны таксама маюць свой свет, яны здольныя нам яго паказаць, расказаць пра многае чароўна і хвалююча. Толькі людзі ў мітусні спраў і спешцы за недарэчным не імкнуцца ўслухоўвацца ў галасы Прыроды, у іх няма часу і жадання слухаць і размаўляць з кветкамі. Для мяне расліны — мае самыя верныя сябры, мы разам ствараем карціны, разам імкнемся данесці свае пачуцці, рэпрадуктаваць нейкія жыццёвыя сітуацыі...

— **Значыць, марныя спробы займацца фларыстыкай без умення размаўляць з кветкамі?**

— Фларыстыка можа насіць і прыкладны характар. Каб дэкаратыўна зкампанаваць расліны, не абавязкова чуць іх галасы. Аднак фларыстыка — гэта і мастацкая творчасць. Для прыкладу: можна засушыць ружу і паказаць знешнюю прыгажосць кветкі, а можна расказаць пра яе душу, падкрэсліць яе калючасць або пяшчотнасць. Стварыць хвалюючую карціну не атрымаецца, калі не адчуваць, не разумець, не любіць Прыроду. Кветкі валодаюць асаблівай эмацыянальнай энергіяй, яны здольныя выклікаць у людзей пачуцці самага шырокага спектра, ад чароўнага захаплення да шчымлівай тугі. Іх эмацыянальная энергія — вялікая сіла, пад уздзеянне якой падпадаў кожны з нас.

— **Адвечнае пытанне — з чаго пачаць?**

— Па прынцыпу «ад простага да складанага». Пачынайце з вырабу закладак для кніжак, паштовак да святаў — між іншым, цудоўны падарунак сваімі рукамі вашым блізкім і сябрам. Потым пераходзьце да аплікацый, пано, магчыма — да дэкаратыўнага аздаблення шкатулак, парфюмерных каробачак, кухонных скрыначак, хлебніц, палічак. (Аднак памятайце, для раслін смяротная павышаная вільготнасць). І нарэшце — кампазіцыі з засушаных кветак і раслін. У залежнасці ад вашага мастацкага густу і светаразумення — іх вынік.

Асновай могуць служыць каляровы кардон, папера, мяккія штучныя скураныя абрэзкі, велюр, аксаміт, зрэшты, што прыйдзе асабіста вам у галаву і адпавядае вашай ідэі, задумцы. Некалькі складаней, калі за аснову бярэцца тканіна. Белую баваўняную расфарбоўваюць гуашшу, калі хочаце надаць неяркі тон, адценне, проста «памыйце» ў гуашы. Клеем ПВА расліны, кветкі або іншы прыродны матэрыял мацуюцца да асновы. Па жаданню выбіраецца рамка; каб захаваць кампазіцыі ад знешняга адмоўнага ўздзеяння паветра і вільгаці, накладваецца шкло. Арыгінальна выглядае аснова з сухога, наклеенага на кардон імху або лішайнікаў. Кветкі, расліны і лісце, як правіла, засушваюць плоскасным спосабам: раскладваюць матэрыял у старых газетах, перакладваюць стосам газет зверху, потым на ўсю шырыню кладуць дошку (фанеру) і груз. Праз 7—9 дзён расліны высыхаюць, і іх складваюць для зручнасці ў асобны альбом, адкуль выбіраюць потым матэрыял для кампазіцыі.

Калі адчуваеце жаданне, паспрабуйце. А раптам цуд атрымліваецца не толькі ў чараўнікоў і прафесіяналаў?

Гутарыла А. ФІЛІПЧЫК.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

28 лістапада
Зак. 2080.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.